ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
6 09 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

БРУТАЛЫ Ў... КАРУНКАХ

Трымайцеся, спадарства... У мяне навіна, ад якой хочацца, прабачце, толькі плявацца і мацюкацца... («— Аааааааааа! — Супакойся і паспрабуй растлумачыць адным словам, што адбылося. — А!») Дык вось, выкарыстоўваючы па зразумелых прычынах шматкроп'е і узяўшы сябе ў рукі... Адзін аўстралійскі брэнд выпусціў карункавую споднюю бялізну для... мужчын.

Адразу бяру невялікую паўзу, каб нагадаць эпізод з фільма «Вораг дзяржавы» з вядомым Уілам Смітам. Памятаеце, як да паспяховага адваката ў яго выкананні выпадкова трапляе кампрамат на высопастаўленага чыноўніка і герой імгненна ператвараецца ў сапраўдную пагрозу для нацыі? Там ёсць эпізод, калі галоўная дзейная асоба стужкі набывае ў падарунак жонцы на свята сюрпрыз — камплект карункавай бялізны. Па ходу адбываецца такі жартаўлівы дыялог. «— Прыкупіў сёе-тое з ніжняй бялізны. Гэта ж не забаронена? — Вашай жонцы? — Не, для сябе. Я прыбіраюся жанчынай па выхадных. Вы нават не ўяўляеце, як пара трусікаў можа падняць патэнцыю». Дык вось, за прайшоўшыя з моманту здымак фільма 20 гадоў змяніўся Уіл Сміт. Нагадаю, ён нядаўна запрашаў на спатканне робата Сафію, нават спрабаваў пацалаваць андроіда і быў прыніжаны апошнім за сваю творчасць. («Яна сцягнула з сябе ніжнюю бялізну, чым нанесла пацярпеламу найцяжэйшую маральную траўму, несумяшчальную з сексам».) Змянілася, як бачыце, і «мода»... («— Ты чаму ходзіш па кватэры ў адных трусах? — У двух горача».)

Вяртаючыся да пачатку нататак. Калекцыя ўключае ў сябе, прабачце за пералік, мноства мадэляў бюстгальтараў, трусоў, выробленых з шоўку, саціну і карункаў. Усе мадэлі прадстаўлены ажно ў пяці памерах. Божа, так і хочацца сказаць: як сумна я жыву... («Не тое, каб я злавалася, але каб ты гарэў у агні, а ў мяне ў руках была вада, я б яе выпіла».) І ведаеце што? «Мая дзяўчына ў захапленні, калі я надзяваю бюстгальтар і трусы ў тон», — цытуюцца словы задаволенага кліента ў водгуках да аднаго з топаў. («Я не мацюкаюся. Я ўсяго толькі выкарыстоўваю ненарматыўную лексіку ў мэтах больш поўнага і лаканічнага выражэння сваіх эмоцый».) Як усё змянілася, аказваецца... Свае маладыя гады ўжо неяк і прыгадваць няёмка. («Калі ў твайго хлопца дзве цэлыя аднолькавыя шкарпэткі, значыць, не ты рашыла, што ў цябе сёння будзе секс».)

«Яны цудоўныя, вельмі якасныя і сексуальныя», — заходзіцца салаўём ад захаплення бялізнай іншы пакупнік. Амаль што як жанчына, не знаходзіце? Дарэчы, памятаеце, як у Казахстане хлопец пераапрануўся ў дзяўчыну і дайшоў да фіналу нацыянальнага конкурсу прыгажосці? Ён зрабіў жаночую прычоску, макіяж і даслаў свае фотаздымкі для ўдзелу ў ім, быў адабраны з прыкладна чатырох тысяч удзельніц і ў выніку трапіў у лік дзесяці фіналістак. Толькі пасля гэтага прызнаўся ў падмане. Сам хлопец, які працуе мадэллю, сказаў, што вырашыў прыняць удзел у конкурсе, пайшоўшы ў заклад з сябрамі. І тлумачыў, што хацеў звярнуць увагу на гонку дзяўчат за штучным хараством, калі ўсе яны ў выніку становяцца аднолькавымі: на адзін капыл апранаюцца, фарбуюцца. А ён, маўляў, з такім падыходам не згодны і лічыць, што прыгожае ўсё тое, што індывідуальнае. («Дзяўчыне лёгка прыцягнуць ўвагу: надзела чырвоную сукенку — і ўсё! Ну, у прынцыпе і хлопцу лёгка: надзеў чырвоную сукенку — і ўсё!») Што гэта было: сапраўды спрэчка ці... Ці, як задаваліся пытаннем героі мультфільма «Следства вядуць Калабкі»: «Або нешта здарылася, або адно з двух». («Прызыўнікоў з нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй ў ваенкамаце называюць — «нягоднікі».)



У Вялікабрытаніі гэтым летам было вельмі спякотна. І тамтэйшыя будаўнікі ў адным з графстваў «прышпіліліся»: прыйшлі на работу ў сукенках і спадніцах, каб абысці забарону на нашэнне шортаў. Апошнія па тэхніцы бяспекі надзяваць нельга. Але і працаваць у шчыльнай робе на гарачыні было некамфортна. І рабочыя дамовіліся прыйсці на аб'ект у адзенні, што пазычылі ў сясцёр і жонак. Дзякуючы правілам гендарнай роўнасці, нашэнне жаночага адзення на будаўнічай пляцоўцы не забаронена. (Чаму толькі там? «Хачу быць гэткім самым самаўпэўненым, як тоўстая баба ў ласінах».) Уяўляеце, як выглядалі тыя брытанскія будаўнікі? («Ідучы ў казіно, заўсёды надзявайце новыя трусы. Магчыма, у іх вам давядзецца вяртацца дадому».) Дык тое ж быў жарт. Рабочыя ў выніку дабіліся для сябе паслаблення ў плане адзення. А ўявіце зваротную сітуацыю: прыходзіць дадому той самы брутальны будаўнік, скідвае робу і надзявае нешта са згаданай калекцыі...

Працягнуць пра ўсе гэтыя рушы і карункі хачу гісторыяй з інтэрнэту ў тэму. «Калі ты зараз барадаты, ты — модны. А зараз у кожнага другога барада. У кожнага, але не ўсім гэтыя бароды пасуюць. Я зараз гавару пра гэтых «плюшавых» хлопцаў, якія раптоўна вырашылі стаць мужнымі. Цела дзіцяці, галава дрывасека. Я скажу так: калі ў цябе твар барадаты, у цябе і сэрца павінна быць барадатым. Я нядаўна бачыў, як адзін такі барадаты брутал стаяў у краме і сварыўся з прадаўшчыцай наконт пратэрмінаванага ёгурту. Ты — барадаты мужык. Ты ўвогуле не павінен ведаць, што такое ёгурт. Ты павінен піць малако адразу з каровы. Браць вось так карову і піць малако, пакуль карова не скончыцца. А потым выкідваць пустую карову. Калі трапіў пустой каровай у урну — загадай жаданне».

Што, не так? Як гаварыў Міміно з аднайменнага фільма вуснамі сапраўднага мужчыны і барадача Вахтанга Кікабідзэ: «Я табе адзін разумны рэч скажу... Я так думаю».

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«ПЕРШЫ БУКЕТ БЫЎ... ПЛАСТЫКАВЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У гэты час былі паездкі на конкурсы, бясконцыя канцэрты, фестывалі, гастролі... Бурнае творчае жыццё. І завяршыла сваю прафесійную падрыхтоўку паступленнем у магістратуру ў Акадэмію музыкі на спецыяльнасць «магістр мастацтвазнаўства».

— Як пасля гэтага аказаліся ў музычным тэатры?

— Ніколі не думала, што буду працаваць тут. Заўсёды марыла спяваць у оперы і на гэта настройвалася. Як лічу сама, у тэатр трапіла выпадкова, але палюбіла яго ўсёй душой і засталася назаўсёды!

Пачалося ўсё з конкурсу вакалістаў імя С. Манюшкі, які праходзіў у Мінску ў Музычным тэатры. Пасля яго мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр тэатра запрасілі мяне на галоўную ролю ў першы нацыянальны гістарычны мюзікл «Соф'я Гальшанская». Уласна з гэтага і пачалося маё прафесійнае тэатральнае жыццё. Пасля Соф'і былі іншыя пастаноўкі: «Вяселле ў Малінаўцы», «Лятучая мыш», «Юнона і Авось» і г. д. Увогуле, Музычны тэатр стаў для мяне другім домам.

— Ці цяжка было ўліцца ў калектыў?

— Па першым часе — так, вельмі. Напэўна, мяне яшчэ выратавала тое, што я цалкам не адчувала адказнасці за ўскладзеныя на мяне абавязацельствы і велізарны крэдыт даверу, які аказала кіраўніцтва. Я проста працавала, шмат працавала і старалася прыйсці да годнага выніку. І ён з'явіўся: на трэцім конкурсе тэатральнага мастацтва спектакль быў удастоены Нацыянальнай тэатральнай прэміі.

— Ці часта вы ездзіце на гастролі?

— Увогуле ў нас сям'я інтэрнацыянальная, сваякі жывуць у розных краінах на розных кантынентах. І цяпер, не без маёй дапамогі, мы набылі прыхільнікаў ужо па ўсім свеце. Хацелася б верыць, што Музычны тэатр будзе толькі пашыраць свой гастрольны спіс. Нашых артыстаў усюды любяць, усюды чакаюць, і я ўпэўнена, што з такім прафесійным узроўнем падрыхтоўкі, з неверагоднай самааддачай і любоўю, з якой яны працуюць, немагчыма не заваяваць нават самых патрабавальных гледачоў.

Гастролі — заўсёды яркія эмоцыі для артыста. Мы заўсёды вельмі чакаем іх, таму што ў першую чаргу гэта магчымасць прывезці і паказаць часцінку нашай цудоўнай краіны за мяжой, нашы найцікавейшыя спектаклі. А нам — пазнаёміцца з новай культурай, даведацца і паглядзець, як працуюць артысты ў іншых краінах, у іншых тэатрах, павучыцца, паглядзець і ўзяць для сябе нешта для таго, каб зноў здзіўляць гледача, атрымліваць яркія эмоцыі, зараджацца пазітыўнай энергетыкай. І вядома, магчымасць пабыць у кампаніі сваіх аднадумцаў. Не так часта атрымліваецца сабрацца разам. У нас няма карпаратываў, выездаў на прыроду. Усе святы мы адзначаем на працы! Таму гастролі — гэта той час, калі мы можам не толькі разам шчыраваць, але і разам адпачываць!

— Вы працуеце ў жанры аперэты...

— Распаўсюджана памылковае меркаванне, што ён — лёгкі і вясёлы: песні, танцы... Здавалася б, нічога складанага. А насамрэч — гэта неверагодна цяжкі і, мабыць, самы сінтэзаваны музычны жанр, дзе артыст павінен не проста прыгожа і правільна спяваць, ён павінен добра танцаваць і быць выдатным драматычным акцёрам, каб не страціць тэмпарытм спектакля, які канцэнтруецца і ўстанаўліваецца праз музычныя і танцавальныя нумары.

— Якія ролі вы іграеце? Ці ёсць у вас любімыя?

— Я моцна люблю сваіх гераінь, таму кожная роля для мяне — любімая. Соф'я — дарагая за яе самаадданасць і моцны характар. Разам з тым яна шчырая, вельмі чыстая і ў яе вялікая добрая душа, якая і выратавала гераіню ад немінучай смерці. Ярынка — гэта іскра, эмацыянальнасць, яна вельмі шустрая, смелая, баявая, але ў той жа час вельмі мяккая, кахаючая, гатовая аддаць жыццё за праўду і сумленнасць. Гераіня «Лятучай мышы» Адэль захапляе мяне сваёй упартасцю. Яна сваім дапытлівым розумам, сваім какецтвам, вытанчанасцю і велізарнай працаздольнасцю дамагаецца пастаўленай мэты: сціплая вясковая дзяўчына атрымлівае ролю ў вядучым тэатры. Вельмі любіла ролю Канчыты з «Юноны і Авось» — там наогул цэлае жыццё пражываеш у маленькім адрэзку сцэнічнага часу.

— А чым адрозніваюцца дзіцячыя ролі ад дарослых?

— Вельмі люблю дзіцячыя спектаклі. У мяне іх няшмат, усяго два: «Прыгоды Герды і Кая» і «Баль у Папялушкі». Дзеці — гэта зусім іншы глядач. Яны заўсёды сумленныя, шчыра выказваюць свае эмоцыі. Калі ім падабаецца, ты гэта адчуваеш: табе суперажываюць, дапамагаюць, удзельнічаюць у спектаклі. Таму заслужыць прызнанне дзяцей заўсёды больш важна і складана, чым дарослых!

— Як вы праводзіце свой вольны час?

— У нашай прафесіі трэба вучыцца пастаянна. Як толькі спынішся — адразу рэгрэс. Я заўсёды стараюся не сядзець на месцы. Мне цікава ўсё: люблю оперу, аперэту, імкнуся бываць на ўсіх даступных гастрольных спектаклях іншых тэатраў. Вельмі люблю драматычныя: Рускі тэатр, Тэатр беларускай драматургіі, у іх геніяльныя пастаноўкі. Люблю тэатр антрэпрызы «Альфа канцэрт», хаджу ў філармонію на сімфанічныя канцэрты.

Я вельмі актыўны чалавек. Займаюся спортам, стараюся часцей бываць за горадам, на свежым паветры. Мне цікава ўсё новае, усё незвычайнае для мяне. Люблю працаваць на пераадоленне сябе і звычайна заўсёды працую на вынік.

Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка II курса
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры
і мастацтваў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.09.2018 г.